ЭКАНАМІЧНЫЯ КАНТАКТЫ І ПРАЕКТЫ

Урадавая дэлегацыя Беларусі на чале з прэм'ер-міністрам Міхаілам Мясніковічам знаходзіцца з афіцыйным візітам у Манголіі з 3 па 5 верасня.

Міхаіл Мясніковіч сустрэўся ўчора з Прэзідэнтам Манголіі Цахіягійнам Элбэгдоржам. Бакі абмеркавалі шэраг пытанняў, у тым ліку якія датычацца магчымасцяў арганізацыі транспартнага калідора з Манголіі праз Беларусь да партоў Балтыі. Па выніках сустрэчы Цахіягійн Элбэгдорж пацвердзіў сваю гатоўнасць падтрымаць тыя праекты, якія будуць рэалізоўвацца ўрадамі дзвюх краін у розных напрамках. Гэта і стварэнне сумесных вытворчасцяў, перадача тэхналогій, праекты ў галіне адукацыі і навукі, ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва і інш.

Міхаіл Мясніковіч перадаў кіраўніку Манголіі найлепшыя пажаданні ад Прэзідэнта Беларусі і запрасіў яго наведаць рэспубліку з афіцыйным візітам.

Учора Беларускі прэм'ер сустрэўся з прэм'ер-міністрам Манголіі Норавынам Алтанхуягам. Гэта першы візіт на ўзроўні кіраўніка ўрада з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж краінамі ў 1992 годзе. На думку прэм'ераў, ён дасць магчымасць адкрыць новыя межы ў супрацоўніцтве Беларусі і Манголіі ва ўсіх галінах і будзе садзейнічаць пашырэнню і развіццю дружалюбных адносін паміж краінамі.

«Сёння дзякуючы намаганням урадаў дзвюх краін, а таксама камерцыйных арганізацый эканамічныя кантакты і праекты Беларусі і Манголіі развіваюцца даволі паспяхова. Пры гэтым патэнцыял у нашых краін вышэйшы за той узровень тавараабароту, які мы сёння маем, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Таму мы хацелі б прапанаваць Манголіі некалькі іншую стратэгію супрацоўніцтва, якая адрозніваецца ад традыцыйнай. Мы лічым, што гандлёвае супрацоўніцтва, таварнае неабходна дапоўніць інвестыцыйным. Забяспечыць адпаведныя фінансавыя механізмы, інвестыцыі, экспартнае крэдытаванне, праектнае фінансаванне». На думку беларускага прэм'ера, гэта дасць магчымасць партнёрам зрабіць рэзкі скачок у развіцці гандлёва-эканамічных і інвестыцыйных праектаў.

У ходзе перагавораў мангольскі бок выказаў зацікаўленасць развіваць больш інтэнсіўна супрацоўніцтва з Беларуссю, у прыватнасці ў сферы прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Норавын Алтанхуяг прапанаваў арганізаваць сумеснае прадпрыемства па вытворчасці харчовай прадукцыі. Ён агучыў зацікаўленасць мангольскага боку развіваць супрацоўніцтва з Беларуссю ў сферы адукацыі і навукі, а таксама па шэрагу іншых напрамкаў.

Кіраўнік беларускага ўрада адзначыў, што Беларусь настроена на доўгатэрміновае супрацоўніцтва з Манголіяй. «Мы рады, што гэтыя падыходы падтрымліваюцца яе ўрадам , — сказаў ён. — Думаю, што нашы сумесныя праекты будуць уключаны ў склад дзяржаўных праграм урада, што будзе (асабліва на першапачатковым этапе) садзейнічаць паспяховаму пашырэнню нашых сумесных прадпрыемстваў на мангольскім рынку».

На заканчэнне сустрэчы прэм'ер-міністр Беларусі запрасіў кіраўніка мангольскага ўрада Норавына Алтанхуяга наведаць з афіцыйным візітам Беларусь.

У чацвер, 5 верасня, кіраўнік беларускага ўрада прыме ўдзел у цырымоніі адкрыцця Нацыянальнай выстаўкі Рэспублікі Беларусь, а таксама ў рабоце Беларуска-мангольскага бізнес-форуму.

ТЭЛЕБАЧАННЕ ПАДНЯБЕСНАЙ УБАЧАЦЬ І БЕЛАРУСЫ

Пагадненне аб гэтым было падпісана ўчора на сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі Анатоля Рубінава з членам Пастаяннага камітэта Палітбюро ЦК Камуністычнай партыі Кітая Лю Юньшанем.

«Ваш візіт мае надзвычай вялікае значэнне і, у прыватнасці, закліканы закрыць яшчэ адно звяно, якое было недастаткова развіта ў сістэме нашых адносін. Я маю на ўвазе ўзаемадзеянне СМІ», — сказаў Анатоль Рубінаў. На яго думку, гэта гістарычны момант для развіцця супрацоўніцтва СМІ дзвюх краін, асабліва тэлебачання. «Нам цікава было б бачыць, што дзеецца ў Кітаі. Але не заўсёды можна паехаць і зняць сюжэт. Напэўна, кітайцам таксама цікава ведаць, як развіваецца Беларусь», — сказаў ён. Таму было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай Дзяржтэлерадыёкампаніяй і Цэнтральным тэлебачаннем Кітая.

Дарэчы, Анатоль Рубінаў адзначыў, што з 2005 года супрацоўніцтва дзвюх краін набыло стратэгічны характар. А пасля сёлетняга візіту ў КНР Прэзідэнта Беларусі адносіны перайшлі на ўзровень усебаковага стратэгічнага партнёрства. Кітай удзельнічае ў інвестыцыйных праектах і выдзеліў крэдытную лінію на $16 млрд. Асобна Анатоль Рубінаў адзначыў праект па стварэнні Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка. Важным з'яўляецца і супрацоўніцтва ў палітычнай сферы: «У нас адзіныя падыходы ў галіне сусветнай палітыкі. Мы заўсёды дзякуем КНР за пастаянную падтрымку Беларусі ў міжнародных арганізацыях, найперш у ААН». Больш за тое, Беларусь цвёрда стаіць на пазіцыі пра ўз'яднанне Тайваня з КНР і лічыць гэта непазбежнай падзеяй, якая павінна адбыцца.

Спікер закрануў і тэму супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, навукі, культуры і вайсковай сферы.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ЗЯМЕЛЬНЫЯ ЎЧАСТКІ — НА НОВЫХ УМОВАХ

З першых дзён верасня пачынаюць дзейнічаць новыя патрабаванні пры адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў. Аб гэтым гаворыцца ва Указе кіраўніка дзяржавы ад 5 чэрвеня 2013 года № 258.

Згодна з гэтым дакументам, цяпер зямельныя ўчасткі для будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў будуць прадастаўляць у Мінску і абласных цэнтрах толькі камунальным унітарным прадпрыемствам па капітальным будаўніцтве, а таксама юрыдычным асобам — пераможцам конкурсу па выбары забудоўшчыка. Указ дае магчымасць вызначыць найбольш выгадныя прапановы ад заказчыкаў (забудоўшчыкаў) па будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў, акрамя жылых дамоў павышанай камфортнасці. Таксама гэта дасць магчымасць выключыць злоўжыванні пры прадастаўленні зямельных участкаў пад будаўніцтва.

Камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы па капітальным будаўніцтве, а таксама юрыдычныя асобы — пераможцы конкурсу па выбары заказчыка (забудоўшчыка) з'яўляюцца заказчыкамі па выкананні праграм дзяржаўнага заказу на будаўніцтва жылых памяшканняў. Ім участкі будуць даваць без правядзення аўкцыёну на права часовага або пастаяннага карыстання. Што тычыцца зямельных участкаў для будаўніцтва жылых дамоў павышанай камфортнасці, то яны, як і раней, будуць прадастаўляцца па выніках правядзення аўкцыёнаў.

Шматдзетным сем'ям, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылля даюцца па-за чаргой. Пры гэтым такія ўчасткі ў Мінску, абласных цэнтрах і гарадах абласнога падпарадкавання будуць прадастаўляцца шматдзетным сем'ям, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у прыватную ўласнасць без унясення платы за зямельны ўчастак.

Акрамя таго, зараз, у адпаведнасці з указам, абавязак па звароце па дзяржаўную рэгістрацыю гэтых зямельных участкаў ускладаецца выключна на арганізацыі па землеўпарадкаванні. Гэта выключыць неабходнасць асабістай прысутнасці грамадзян у тэрытарыяльных арганізацыях па дзяржрэгістрацыі нерухомай маёмасці, а значыць цяпер яны не прапусцяць устаноўленага заканадаўствам тэрміну для звароту па ажыццяўленні рэгістрацыйных дзеянняў.

Цяпер дзяржаўная рэгістрацыя стварэння зямельнага ўчастка і ўзнікнення права на яго, выдача пасведчання аб дзяржрэгістрацыі ажыццяўляюцца ў тэрмін не больш за 7 працоўных дзён. У выпадку выканання вялікага аб'ёму працы, неабходнай для ажыццяўлення рэгістрацыйнага дзеяння, яна можа выконвацца ў тэрмін да 14 працоўных дзён.

Указам прадугледжана, што пры прадастаўленні зямельнага ўчастка ў часовае карыстанне або арэнду тэрмінам да аднаго года дзяржаўная рэгістрацыя яго стварэння і ўзнікнення правоў на яго не ажыццяўляецца, а заключэнне дагавора арэнды зямельнага ўчастка ў пісьмовай форме не патрабуецца. Дакументам удасканальваецца парадак прадастаўлення зямельных участкаў для рэалізацыі інвестыцыйных дагавораў, заключаных з нашай краінай. Выканкамы будуць абавязаны фарміраваць спісы ўчасткаў (апошнія падрыхтаваны для наступнага прадастаўлення іх інвестарам). Гэтыя спісы павінны размяшчацца на інфармацыйных стэндах і афіцыйных сайтах выканкамаў.

Зараз указ робіць больш жорсткімі патрабаванні па размяшчэнні аб'ектаў нерухомасці на землях сельгаспрызначэння і ляснога фонду. Цяпер, калі спатрэбіцца пабудаваць дом на гэтых землях, трэба будзе ўзгадніць рашэнне з Прэзідэнтам Беларусі. Пры гэтым устанаўліваюцца канкрэтныя выпадкі, пры якіх не патрабуецца такое ўзгадненне месца размяшчэння зямельных участкаў. Гаворка ідзе аб узвядзенні і абслугоўванні падземных лінейных збудаванняў (газапроводаў, нафтапроводаў, ліній электрапередач, сувязі і іншых збудаванняў), рэканструкцыі лінейных збудаванняў, уключаючы чыгунку і аўтамабільныя дарогі. Сюды адносяцца эксплуатацыйныя свідравіны для здабычы вуглеводароднай сыравіны і аб'ектаў, звязаных з іх абслугоўваннем, а таксама будаўніцтва і абслугоўванне аб'ектаў нерухомай маёмасці ў межах свабодных эканамічных зон.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Парламент

У ТУРЦЫЮ — ТРЫ РАЗЫ ПА 30 ДЗЁН

У ніжнюю палату парламента для разгляду на трэцяй сесіі, якая адкрыецца 2 кастрычніка, паступіў законапраект аб ратыфікацыі міжурадавага пагаднення паміж Беларуссю і Турцыяй аб адмене віз.

— Думаю, гэта для многіх беларускіх грамадзян рэзанансны законапраект, — сказала Галіна Філіповіч, дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, — бо ён дазволіць знаходзіцца на тэрыторыі Турэцкай Рэспублікі на працягу 30 дзён без афармлення візы. Усяго на працягу года можна будзе знаходзіцца на тэрыторыі Турцыі 90 дзён.

Законапраект таксама дазволіць вырашыць і важныя дзяржаўныя пытанні, заўважыла дэпутат, бо сёння Беларусь зацікаўлена ў захаванні фінансавых пераваг ад удзелу ў Мытным саюзе, а паміж Казахстанам і Турцыяй, Расіяй і Турцыяй ужо існуюць бязвізавыя рэжымы. «Мы думаем , што гэта дазволіць больш актыўна прыцягнуць у Беларусь дзелавыя колы Турцыі, у прыватнасці, бізнесменаў, якія ўжо працуюць на тэрыторыі Расіі», — сказала Галіна Філіповіч.

У сваю чаргу дзелавая актыўнасць дзвюх краін прыцягне працоўныя рукі, у першую чаргу, у будаўнічую галіну Беларусі, спадзяюцца дэпутаты. Чакаецца таксама рост актыўнасці ў сферы студэнцкіх абменаў. Усё гэта дазволіць захаваць баланс інтарэсаў дзвюх краін пры прыняцці гэтага рашэння.

Бязвізавы рэжым не будзе распаўсюджаны на асоб, мэта знаходжання якіх у краіне будзе звязана з працаўладкаваннем, навучаннем, навуковай дзейнасцю, уз'яднаннем сям'і і пражываннем.

Распрацоўшчыкі законапраекта заклалі ў дакумент механізм, які павінен прадухіліць рост нелегальнай міграцыі. З гэтай мэтай адзін з артыкулаў Пагаднення прадугледжвае, што рашэнне ўступіць у сілу толькі тады, калі паміж Беларуссю і Турцыяй будуць заключаны дагаворы пра абавязковае прыняцце дэпартаваных грамадзян.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

РАЗВІЦЦЁ ПАРТНЁРСТВА

4 верасня Прэзідэнт Балівіі Эва Маралес прыбыў з афіцыйным візітам у Беларусь. Наведаць нашу краіну яму прапанаваў у сакавіку 2013 года беларускі Прэзідэнт падчас перамоў на пахаванні Уга Чавеса. Як вядома, Уга Чавес усяляк падтрымліваў развіццё Беларуссю кантактаў з іншымі дружалюбнымі краінамі Лацінскай Амерыкі, акрамя Венесуэлы, і раней абмяркоўваліся планы, якім чынам Беларусь і Балівія могуць развіваць стасункі пры актыўным удзеле Венесуэлы.

Балівія з'яўляецца значнай краінай у рамках Лацінскай Амерыкі. Яе назва, дадзеная ў гонар рэвалюцыянера Сімона Балівара, храбрыя дзеянні якога сталі важнай вяхой у вызваленні іспанскіх калоній у рэгіёне ад іспанскага валадарства, само па сабе да многага абавязвае. Магчыма, менавіта таму цяпер краінай кіруе Эва Маралес, які выйграў ужо другія прэзідэнцкія выбары з такой сур'ёзнай перавагай, пра якую могуць толькі марыць дзейныя прэзідэнты ў некаторых іншых краінах. Ён з'яўляецца першым прэзідэнтам краіны, які па сваім паходжанні адносіцца да карэннага насельніцтва Балівіі, і прадэманстраваў рашучасць абараняць яго інтарэсы. Магчыма, гэта з'яўляецца адной з прычын, чаму заходні свет глядзіць на балівійскага прэзідэнта з яўным неадабрэннем. Эва Маралес таксама выступае за тое, каб нетры Балівіі прыносілі прыбытак перш за ўсё балівійскай дзяржаве і насельніцтву краіны, а не замежным карпарацыям, як гэта было да яго прыходу да ўлады. Раней ён заяўляў: «Калі мы хочам вызваліць сябе, калі мы хочам вырашыць нашы сацыяльныя і эканамічныя праблемы, мы павінны вызваліць людзей, вызваліць іх эканоміку — асабліва іх прыродныя багацці. Толькі тады магчымыя справядлівасць і роўнасць». А паколькі прыродныя багацці Балівіі велізарныя, гэта таксама выклікае да яго стойкую непрыязнасць з боку тых заходніх краін, буйныя карпарацыі якіх пацярпелі ад праведзенага Маралесам перараздмеркавання даходаў ад нетраў краіны на карысць насельніцтва, а не іншаземцаў.

Чым Беларусь падобная на Балівію? Перш за ўсё адзначым, што колькасць насельніцтва Балівіі толькі нязначна пераўзыходзіць Беларусь. З'яўляючыся сярэднімі па гэтым паказчыку краінамі, Беларусь і Балівія маюць агульныя праблемы ў зносінах з буйнымі краінамі, якія часта лічаць за лепшае размаўляць з невялікімі дзяржавамі з дастаткова ганарыстай пазіцыі. Агульнай з'яўляецца і праблема адсутнасці выхаду да сусветнага акіяна, якая аб'ектыўна ўскладняе развіццё знешняга гандлю з-за неабходнасці карыстацца паслугамі пасярэднікаў для доступу да самага таннага віду транспарту — марскога. Калі Беларусь усё ж змагла ў такіх умовах развіць значны знешні гандаль, то ў Балівіі яшчэ напярэдадні сур'ёзная праца над гэтым. Так, па выніках 2012 года знешні гандаль Балівіі склаў толькі каля 11 мільярдаў долараў, у той час як у Беларусі ён перавысіў 100 мільярдаў.

Пазіцыі Беларусі і Балівіі па многіх пытаннях унутранага і знешняга жыцця дзвюх дзяржаў вельмі падобныя. Менавіта гэта тлумачыць сур'ёзныя поспехі ў супрацоўніцтве на міжнароднай арэне, уключаючы арганізацыі сістэмы ААН. Зыходзячы з наяўных паспяховых зачынаў у палітычнай сферы, надышоў час для інтэнсіўнай эканамічнай кааперацыі. Прасторы Балівіі даюць вялікія магчымасці для беларускага бізнесу, прычым не толькі ў пераносным сэнсе, але і ў прамым (па памеры тэрыторыі Балівія ўваходзіць у трыццатку самых буйных краін свету). Сур'ёзны інтарэс для беларускіх прадпрыемстваў уяўляў бы збыт сваёй прадукцыі, у тым ліку той, што Балівія магла б выкарыстоўваць для мадэрнізацыі сваёй эканомікі. Мэтазгодна развіваць сумесныя прадпрыемствы і зборачныя вытворчасці ў сферы машынабудавання. З улікам пазітыўнага вопыту ў Венесуэле, Беларусь магла б паўдзельнічаць і ў праектах па здабычы прыроднага газу і па газіфікацыі правінцый Балівіі, тым больш што па запасах прыроднага газу Балівія знаходзіцца на другім месцы ў Паўднёвай Амерыцы. Магчымы ўдзел у здабычы і іншых відаў прыродных рэсурсаў, а таксама садзейнічанне ў іх разведцы, паколькі вялізная тэрыторыя Балівіі яшчэ можа прынесці прыемныя сюрпрызы. Самі прадстаўнікі Балівіі выказвалі зацікаўленасць у садзейнічанні Беларусі па развіцці аграрнай сферы эканомікі краіны. Гатова Беларусь аказваць паслугі для грамадзян Балівіі і ў адукацыйнай сферы. Зыходзячы з мноства наяўных магчымасцяў, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў развіццё адносін з Балівіяй пачаць з рэалізацыі 3—4 фундаментальных праектаў.

Неабходна ў цэлым адзначыць, што далейшае пазітыўнае развіццё стасункаў з Балівіяй будзе магчымым у тым ліку зыходзячы з тых поспехаў, якія былі дасягнуты Беларуссю ў Венесуэле. Шырокі прыход беларускіх прадпрыемстваў у Венесуэлу, які адбыўся нягледзячы на жорсткае супрацьдзеянне з боку некаторых заходніх краін, стаў вельмі паспяховай рэкламай для нашай краіны па ўсім свеце. Гэта падчас сустрэчы з беларускім Прэзідэнтам адзначыў і сам Маралес: «Тая мадэль, якая была пабудавана ў адносінах з Венесуэлай, будзе служыць прыкладам для развіцця адносін не толькі з Балівіяй, але і з усёй Лацінскай Амерыкай».

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук.

■ На слыху

ПАНІКА НЕ АДБЫЛАСЯ

Калі прачнуўся, міжволі падумаў: «Трэба сёння па дарозе на працу абыходзіць месцы, дзе ёсць абменнікі, — там, напэўна, будуць чэргі». Але нічога падобнага я не ўбачыў, калі выйшаў з хаты. Людзі такія самыя, як і раней, горад на месцы. Ужо ў рэдакцыі вырашыў пачакаць вынікаў новых таргоў на біржы і, калі курс долара паднімецца яшчэ, прайсціся па абменных пунктах. Рост «амерыканца» яшчэ на дзесяць рублёў да 9030 (пасля трыццацірублёвай «надбаўкі» ў аўторак) стаў для мяне зялёным святлом ва ўсіх сэнсах.

«Жах»

Да гэтага я паспеў паглядзець, што пішуць людзі пра «страшны прарыў 9-тысячнай столі» на форумах. Абмеркаванне, як звычайна, паступова перайшло з прадмета размовы на асобы. Аднак і сярод сваркі «каментатары» пакідалі цікавыя думкі. Праціўнікі пазіцыі «А-а-а! Жах! Долар каштуе ўжо ў сярэднім 9070!» альбо не бачаць у паслабленні рубля неспадзяванкі (маўляў, расіяне сваю валюту абясцэньваюць, значыць, і нас гэта павінна было закрануць), альбо лічаць, што панікаваць, як у 2011-м, ніхто не будзе, бо зараз высокія стаўкі па рублёвых дэпазітах. Атрымліваецца, што беларусы на гэты раз павінны паводзіць сябе больш спакойна. Зараз праверым.

«Усё як звычайна»

Адзін з абменнікаў каля сталічнага ЦУМа павінен быў вось-вось адчыніцца пасля тэхнічнага перапынку. Мне пашчасціла паспець першым у чаргу. Бліжэй да адкрыцця падышлі яшчэ чалавек дзесяць. Шмат хто прабягаў міма дзвярэй, толькі зазіраючы на шыльду з курсамі і нешта падлічваючы ў галаве. Але нават тыя, што стаялі за мною ў чарзе, не былі падобны да людзей, якіх я бачыў два гады таму ўначы на чыгуначным вакзале Полацка ў пошуках цягніка, які верне мяне з камандзіроўкі дадому. Тыя нервова спалі ў зале чакання каля абменніка, прыцягнуўшы з дому падушкі, а гэтыя, сённяшнія, спакойна чакалі сваёй чаргі, каб здаць або набыць валюту для сваіх асабістых патрэб. У асноўным побач са мною стаялі жанчыны гадоў па трыццаць, таму можна выказаць здагадку, што верасень прымусіў іх выдаткаваць шмат грошай на падрыхтоўку дзяцей да школы, — залезлі ў збяражэнні. Адна так і адказала на маё з усмешкай кінутае «9 тысяч усе спужаліся, ці што?»: «Ды не. Проста здаю».

Але тут ужо падняліся жалюзі ў акенцы абменніка, і дзяўчына-касір пытальна паглядзела на мяне. Але я нічога не паклаў ёй у скрынку і растлумачыў, што прыйшоў як карэспандэнт. Дзяўчына вельмі здзівілася. Можна было падумаць, што я прадставіўся тэрарыстам. На мае пытанні наконт таго, ці не сталі пасля ўчарашняга больш купляць валюты, а можа, наадварот, здаваць, адказам стала яшчэ большае здзіўленне на твары касіркі: «Усё як звычайна».

❒❒❒

Паніка не адбылася. Хутчэй за ўсё, пакуль што яна і не адбудзецца, бо, як нагадаў БЕЛТА **кандыдат эканамічных навук Валерый БАРАДЗЕНЯ**, Савет Міністраў, сцвярджаючы асноўныя прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, закладваў максімальны курс долара на канец гэтага года ў памеры да 9500 рублёў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ Спорт

«ЗАЛАТАЯ» КАМАНДА

Ужо некалькі дзён прайшло з трыумфу беларускіх гімнастак на чэмпіянаце свету ў Кіеве. Але значнасць гэтай падзеі, як рэха, адбіваецца дагэтуль. Днямі адбылося ўшанаванне нашых «грацый» і тых людзей, якія прывялі дзяўчат да верхняй прыступкі п'едэстала.

Унікальнасць перамогі беларускіх «групавічак» заключаецца не толькі ў тым, што апошні раз наша каманда святкавала «вікторыю» 15 гадоў таму, але і ў тым, што адбылося гэта ў стагадовы юбілей мастацкай гімнастыкі. Таму цалкам натуральна, што ў гэты дзень і спартсменкам, і іх настаўнікам не хапала рук, каб утрымаць усе падарункі, дыпломы і кветкі.

Ганаровых грамат ад Мінспорту ўдастоіўся абсалютна кожны член трэнерскага штаба, сярод якіх галоўны трэнер нацыянальнай каманды Ірына Ляпарская, старшы трэнер зборнай Таццяна Нянашава, славутая гімнастка, першая савецкая алімпійская чэмпіёнка і старшы трэнер РЦОП па мастацкай гімнастыцы Марына Лобач, нядаўняя алімпійская прызёрка, а цяпер трэнер беларускай каманды Любоў Чаркашына і іншыя. І, безумоўна, памятныя граматы ўручылі чэмпіёнкам свету — Марыне Ганчаровай, Ганне Дудзянковай, Марыі Кацяк, Яне Лукавец, Аляксандры Наркевіч, Валерыі Пішчэлінай, а таксама нашым «асобніцам» — ужо шасціразовай бронзавай прызёрцы сусветнага першынства Меліціне Станюце і падрастаючай «зорцы» айчыннай гімнастыкі Кацярыне Галкінай. Павіншаваў каманду і іх галоўны спонсар — аператар мабільнай сувязі МТС, які падараваў спартсменкам і іх трэнерам новенькія смартфоны. А вось Нацыянальныя латарэі ўручылі нашай «дрым-цім» сертыфікат на 50 млн рублёў, на што тут жа адрэагавала Ірына Ляпарская: «Будзем шыць новыя купальнікі!».

У размове з карэспандэнтам «Звязды» Ірына Юр'еўна адзначыла, што прыемна было дасягнуць такога выніку ў складаны пасляалімпійскі сезон: «У зборнай адбыліся сур'ёзныя змены складу, а гэта заўсёды адчувальна. На месца лідара зборнай прыйшла Меліта Станюта. На 75% абнавілася каманда ў групавых практыкаваннях. Але, як бачыце, мы справіліся. І гэта заслуга вельмі многіх людзей — трэнераў, урачоў, харэографаў — усіх, усіх, усіх».

У канцы вечара віншавальныя словы ад Аляксандра Лукашэнкі ў адрас зборнай па мастацкай гімнастыцы зачытаў памочнік Прэзідэнта па пытаннях спорту, фізкультуры і развіцця турызму Максім Рыжанкоў. І ад сябе іранічна дадаў, звяртаючыся да гімнастак: «Вы зноў захілілі сваімі грацыёзнымі дзявочымі плячыма мужчын-функцыянераў у змрочных касцюмах».

А міністр спорту і турызму Аляксандр Шамко паспеў запэўніць усіх прысутных, што неўзабаве пачнецца доўгачаканае будаўніцтва Палаца мастацкай гімнастыкі — лепшы падарунак для «залатой» каманды.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ПЕРШЫ АБАРАНКАВЫ...

Смаргонь адваюе былую славу сталіцы абаранкаў. 28 верасня менавіта там адбудзецца першы ў гісторыі абаранкавы фэст.

І хоць за права лічыцца радзімай абаранкаў, акрамя Беларусі, змагаюцца і Польшча, і Украіна, даследчыкі ўжо вынеслі свой вердыкт: першапраходцы ў выпяканні абаранкаў — адназначна смаргонцы. А горад на Гродзеншчыне можна смела лічыць радзімай папулярнага вырабу. Трэба адзначыць, што гістарычную справядлівасць аднавіў Вільям Пахлёбкін, выдатны навуковец з Падмаскоўя. Ён, аўтар шматлікіх кулінарных бестселераў, замацаваў на паперы слова «абаранак», падкрэсліўшы дамінантную ролю дзеяслова «абварыць».

Ёсць легенды, што абаранкі (або, па-іншаму, абваранкі, баранкі) прыдумалі ў славутай мясцовай «цыганскай акадэміі», якая спецыялізавалася на дрэсіроўцы мядзведзяў яшчэ ў XVII стагоддзі. Таму першапачаткова кулінарныя вырабы абварваліся выключна дзеля гэтага ляснога звера, а таксама для яго павадыроў. У міжваенны перыяд мясцовыя абаранкі грузілі ў вазы і адпраўлялі не толькі на Гродна і Мінск, але і на Вільню, Маскву. На той час мясцовыя жыхары трымалі 60 пякарняў. На адмысловы тавар попыт не знікаў ніколі.

Кулінарная тэхніка сапраўды мае адметнасці. Цеста павінна быць заварным. Далей робім то шырокія, то вузкія жгуцікі, якія накручваем на палец. Пасля колападобныя вырабы выпякаем.

28 верасня выпякаць абаранкі будуць не толькі смаргонскія хлебапёкі, але і суседзі з іншых раёнаў Гродзеншчыны. З Мінскай вобласці кухары прыедуць таксама.

Генадзь Бычко, намеснік старшыні Смаргонскага райвыканкама, гарантуе, што свята запомніцца надоўга. Як-ніяк гэты фэст — своеасаблівая даніна павагі беларускім традыцыям.

Маргарыта СІДАР.

ПАБУДАВАЛІ АСАБІСТЫЯ КВАТЭРЫ ЗА КОШТ ДОЛЬШЧЫКАЎ

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве ўнутраных спраў Беларусі.

Першыя скаргі забудоўшчыкаў аднаго з грамадскіх аб'яднанняў Мінска пачалі з'яўляцца больш як год таму. Людзям не падабаўся хуткі і беспрычынны рост цэн на кватэры. Міліцыя правяла адпаведную праверку, і высветлілася, што за 20 гадоў існавання аб'яднання ні адзін з яго кіраўнікоў не заплаціў ні капейкі ў якасці ўзносу. Больш таго, на пасяджэннях кіруючага органа неаднаразова прымаліся рашэнні аб аплаце аздараўленчых паслуг членам штаба аб'яднання, а таксама аб прадастаўленні «сваім» людзям беспрацэнтных пазык.

Паводле інфармацыі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Беларусі, пяць членаў штаба, атрымаўшы пазыкі ў памеры больш як Br1 млрд, пабудавалі асабістыя кватэры за кошт дольшчыкаў. На сёння ў дачыненні да іх узбуджаны крымінальныя справы па арт. 426 Крымінальнага кодэкса (перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў). Ім пагражае да дзесяці гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Акрамя таго, гэтыя асобы абавязаны кампенсаваць суму ўрону дольшчыкам.

У МУС адзначылі, што многія злачынствы ў сферы будаўніцтва ўчыняюцца з-за неадрэгуляванай палітыкі цэнаўтварэння ў будаўнічай галіне, што дае магчымасць нядобрасумленным забудоўшчыкам атрымліваць звышпрыбытак за кошт дольшчыкаў.

ЭЛІТНЫ КОРМ НЕ НА КАРЫСЦЬ

Факты нерацыянальнага і безгаспадарчага выкарыстання насення сельскагаспадарчых культур высокіх рэпрадукцый выяўлены супрацоўнікамі камітэта дзяржкантролю Гомельскай вобласці, які правёў праверкі ў гаспадарках, што займаюцца вытворчасцю насення элітных гатункаў сельскагаспадарчых культур.

Высветлілася, што з-за недахопаў пры планаванні аб'ёмаў закупу насення на ўзроўні сельгасхарчаў, пры наяўнасці на Гомельшчыне насення высокіх рэпрадукцый, сельгазарганізацыі выкарыстоўвалі насенне, неадпаведнае стандарту, што ўрэшце негатыўна адбілася на ўраджайнасці збожжавых і зернебабовых культур. У цэлым па вобласці на пасеў ураджаю 2013 года гаспадаркамі было выкарыстана амаль 813 тон некандыцыйнага насення збожжавых культур (0,7%), насення нізкіх рэпрадукцый — 6024 тоны (5,7%).

У той жа час эксперыментальная база «Уваравічы» Буда-Кашалёўскага раёна і эксперыментальная база «Крынічная» Мазырскага раёна насенне высокіх рэпрадукцый скормлівалі скаціне. Так, першае прадпрыемства летась скарміла жывёлам 77 тон насення эліты і суперэліты агульным коштам больш за 322 млн рублёў. Сёлета ў лютым на корм скаціне было выкарыстана 6,5 тоны насення лубіну першага года размнажэння коштам 35,4 млн рублёў. Акрамя таго, у студзені-лютым на Навабеліцкі камбінат хлебапрадуктаў для перапрацоўкі здадзена 102 тоны суперэліты азімай пшаніцы гатунку «Сюіта». Аналагічныя факты Камітэтам дзяржкантролю Гомельскай вобласці выяўлены і на эксперыментальнай базе «Крынічная». З ураджаю мінулага года на корм жывёле была выкарыстана 671 тона збожжа — эліты азімага трыцікале, жыта, яравога ячменю і аўса; здадзена на перапрацоўку хлебакамбінатам 1365 тон збожжа эліты азімага трыцікале гатунку «Вальтарыя».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НЕ ХАПІЛА АРГУМЕНТАЎ — ДАСТАЎ АБРЭЗ

У міліцыю паступіла паведамленне, што ў адным з прыватных дамоў у пасёлку Азярышча пад Мінскам грамадзяніну пагражалі абрэзам паляўнічай стрэльбы. На месца здарэння быў накіраваны аўтапатруль атрада міліцыі асаблівага прызначэння, які нёс службу ў Першамайскім раёне сталіцы.

Па прыбыцці ўсхваляваны мужчына патлумачыў: падчас «высвятлення адносін» са знаёмым дайшло да таго, што апошні прыставіў да яго галавы абрэз. Гэтага грамадзяніна тут жа затрымалі. Ён быў нападпітку і адразу ж пачаў сцвярджаць, што ніякай зброі ў яго няма. Аднак хутка памянёны абрэз быў знойдзены. Яго і пяць патронаў спрабавалі схаваць на агародзе.

У гэты ж дзень нараду АМАП, які ахоўваў правапарадак у Лошыцкім садова-паркавым комплексе, паступіла просьба аказаць дапамогу ваеннаслужачым унутраных войск, што неслі непадалёк службу. На месцы «амапаўцы» ўбачылі, як нецвярозы малады чалавек спрабуе нешта «даказаць» салдатам, размахваючы перад тварам апошніх нажом. Хутка на руках грамадзяніна ўжо былі наручнікі. Дарэчы, у кішэні 24-гадовага затрыманага быў знойдзены патрон калібру 7,62 мм.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АТРЫМАЛА АПЁКІ З-ЗА... ХАЛАДЗІЛЬНІКА

У Мінску з-за ўспышкі газапаветранай сумесі на кухні пацярпела жанчына. Прычына здарэння высвятляецца, аднак, згодна з папярэдняй версіяй, віной траўміравання гаспадыні кватэры шматпавярховіка па вуліцы Варанянскага стаў... халадзільнік.

Як было ўстаноўлена, жанчына проста адчыніла дверцы халадзільнага агрэгата імпартнай вытворчасці 2007 года выпуску. У гэты момант і адбылася ўспышка газапаветранай сумесі, у выніку якой гаспадыня двухпакаёвай кватэры атрымала апёкі твару, шыі, грудзей першай-другой ступені. Пасля агляду брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі яе даставілі ў бальніцу. Мяркуецца, што адбылася ўспышка сумесі ізабутану (холадагенту халадзільніка) з паветрам.

ЗАТРЫМАЛІ ГВАЛТАЎНІКА

Увечары патрулю атрада міліцыі асаблівага прызначэння ГУУС Мінгарвыканкама перадалі трывожнае паведамленне: у кватэры па вуліцы Данілы Сердзіча прымусова ўтрымліваюць дзяўчыну...

На месцы «амапаўцы» былі ўжо праз пару хвілін. Увайсці ў кватэру ім дапамаглі работнікі МНС. Унутры жылля быў затрыманы 49-гадовы мужчына, які, як аказалася, пад пагрозай выкарыстання фізічнай сілы здзейсніў гвалтоўныя дзеянні ў дачыненні да пацярпелай. У самога затрыманага была рэзаная рана ў вобласці локця. Медыкі аказалі яму дапамогу, пасля чаго мужчыну даставілі ў дзяжурную часць Фрунзенскага РУУС.

Сяргей РАСОЛЬКА.